Источник: "Настаўніцкая газета" - 2013-08-31



# Што варта ведаць пра Быхаў і Быхаўшчыну, выпраўляючыся туды ў вандроўку?

**Баркалабава.** З гэтым населеным пунктам (цяпер — аграгарадком, а ў старадаўнія часы — горадам) звязаны, прынамсі, два сімвалы духоўнасці Быхаўшчыны — Баркалабаўская ікона Божай Маці і Баркулабаўскі (Баркалабаўскі) летапіс. Баркалабаўская ікона Божай Маці лічыцца святой апякункай быхаўскай зямлі, і сваім статусам яна абавязана аднаму паданню, якое вельмі падобнае да рэальнай гісторыі. Паводле падання, у 50-х гадах XVII стагоддзя, падчас ваенных дзеянняў рускіх войскаў на тэрыторыі ВКЛ, гэты абраз быў узяты захопнікамі ў адным з беларускіх храмаў і перададзены князю Пажарскаму. У 1569 годзе, калі войска князя Пажарскага падышло да сцен Баркалабаўскага манастыра, абоз, у якім знаходзіўся абраз, раптам стаў як укапаны, і коні, нягледзячы на намаганні фурманаў, не маглі скрануцца з месца. Урэшце ікону занеслі ў манастырскую царкву, паставілі пасярэдзіне і пакінулі да раніцы. А раніцай са здзіўленнем убачылі, што ікона стаяла ўжо каля сцяны з правага боку, быццам выбраўшы сабе месца. Тады ўсе, у тым ліку і князь Пажарскі, вырашылі, што ікона "захацела" застацца ў Баркалабаве, дзе яе і пакінулі. Абраз неаднойчы мяняў сваё "месцажыхарства", цудоўным чынам уратоўваўся ад пажараў і іншых бед. З 2010 года захоўваецца ў храме Іаана Прадцечы адроджанага Баркалабаўскага манастыра. Што тычыцца Баркулабаўскага летапісу, то ён быў створаны там жа, у Баркалабаве, невядомым летапісцам — магчыма, святаром сяла Баркалабава Фёдарам Філіповічам. Ахоплівае перыяд з 1545 па 1608 год. Аўтар праявіў сябе як вельмі таленавіты чалавек (нават у апісаннях побыту) і вялікі патрыёт сваёй радзімы.



Адносна **паходжання тапоніма "Быхаў"** існуе некалькі версій. Адна з іх звязана з легендай пра тое, што некалі пад Дняпром існаваў падземны ход, які звязваў Быхаўскі замак з паселішчам Вараніно і адначасова служыў сховам ад ворага, маўляў, адсюль і пайшла назва горада: "Быхаў" — "быў схоў". Другая версія апелюе да народнага падання пра быхаўскага героя-заступніка нейкага рамесніка Быхаўца, які аднойчы выратаваў горад ад нашэсця татараў. Вось, у прыватнасці, што чытаем у паданні (з кнігі "Магілёўшчына ў легендах і паданнях"): "Асабліва адчайна біўся сам Быхавец. Вось хто малаціў чужынцаў, вось хто ім у знакі даўся! Дзе ні павернецца са сваім двуручным мячом — там цэлая вуліца ў варожым страі ўтвараецца, дзе ні ўзмахне — там завулак. Ворагі нават аднекуль імя ягонае зведалі — ці то пачулі, як да яго людзі звярталіся, ці то нехта яшчэ неяк паведаміў, — але крычалі, перадаючы з вуснаў у вусны: "Быхаў-хан! Быхаў-хан!" Нарэшце не вытрымалі татары і пабеглі, але мала хто ўратаваўся — вірлівы Дняпро стаў для іх апошнім прытулкам. Пад канец сечы загінуў і Быхавец. Яго і ўсіх забітых мястэчкоўцаў пахавалі ў паселішчы на беразе прыгожай ракі. Спачатку яно так і называлася — Быхава магіла, а потым ужо стала Быхавым". Ва ўсякім разе відавочна, што ў аснове слова "Быхаў" ёсць старажытнаславянскі корань "быць", а значыць, Быхаў — гэта тое месца, дзе спрадвечна нешта было ці нехта быў.



**Герб Быхава:** у чырвоным полі дзве скрыжаваныя чыгунныя гарматы. Атрыманы 16 жніўня 1781 года. Гербавы сюжэт выбраны невыпадкова. У Быхаве размяшчалася гарматная майстэрня — так званая людвісарня. У сярэднявечнай гісторыі Быхаў вядомы як крэпасць-аванпост паміж Маскоўскім княствам і Вялікім Княствам Літоўскім.

**31 мая 1393 года** — Быхаў упершыню згадваецца ў грамаце князя Змітра Семяновіча пад назвай "двор Быхаў". Хаця многія гісторыкі лічаць датай заснавання паселішча 1370 год. У 1430 годзе Быхаў згадваецца ў акце ўзвядзення Свідрыгайлы на княжацкі прастол. У гэты час Быхаў пераходзіць у рукі князёў Гаштольдаў, а пасля згасання гэтага роду ў 1542 годзе апынаецца ва ўладанні магутных магнатаў Хадкевічаў. Менавіта гетман Вялікага Княства Літоўскага Ян Караль Хадкевіч, які называўся ў той час "графам на Быхаве, Шклове і Мышы", узяўся ў 1590 годзе за пабудову новага мураванага замка замест ранейшага драўлянага, які быў узведзены яшчэ ў 1540 годзе і да 1590 года неаднаразова атакаваўся данскімі казакамі.

**Вышыня 150,9 (Вышыня герояў, Лудчыцкая вышыня).** Пры вызваленні Быхаўскага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў праяўленым у баях гераізмам сябе абяссмерцілі воіны 556 стралковага палка 165 стралковай дывізіі пад камандаваннем Пятра Васільевіча Качуры. У першы дзень аперацыі "Баграціён", на досвітку 24 чэрвеня 1944 года, яны ў выніку працяглага і адчайнага штурму выбілі ворага з умацавання на вышыні 150,9 метра каля вёскі Лудчыцы і на працягу дня адбілі звыш 20 лютых атак азвярэлых фашыстаў. За выключную мужнасць і адвагу ў баях за вышыню васьмі чырвонаармейцам — Уладзіміру Мартынаву, Пятру Вінічэнку, Гуляму Якубаву і Сундуткалі Іскаліеву (пасмяротна), а таксама Барысу Каваленку, Яфіму Фрадкову, Івану Барысевічу і Галакціёну Размадзе — было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. А ў чэрвені 1984 года да 40-годдзя вызвалення Быхаўскага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў каля вёскі Лудчыцы быў адкрыты Мемарыял Вайсковай Славы. Над велічным мемарыяльным барэльефам з выявамі герояў на насыпаным кургане высіцца гусляр — адвечны сімвал непераможнасці беларускага народа і яго волі да свабоды. Вышыня герояў, або проста Лудчыцкая вышыня, сёння з'яўляецца сапраўды святым і знакавым месцам для быхаўчан. Сюды, як правіла, прывозяць дэлегацыі гасцей раёна, тут быхаўскіх школьнікаў нярэдка прымаюць у піянеры, сюды сваім абавязкам лічаць зазірнуць у дзень вяселля маладыя, каб пакланіцца светлай памяці герояў-вызваліцеляў.



**Быхаўскі замак,** пабудаваны Янам Хадкевічам на высокім правым беразе Дняпра, безумоўна, з'яўляецца выбітным архітэктурным помнікам быхаўскай зямлі. Пры Сапегах, да якіх Быхаў адышоў у 1621 годзе, ён быў зноў перабудаваны. У замкавы комплекс увайшлі палац, жылыя і каменныя будынкі, тры васьмігранныя цагляныя вежы і ўязная вежа з чарапічным купалам. Высокая брама ўязной вежы была дадаткова ўмацавана кратамі і сістэмай жалезных засавак. Да ўязной вежы праз глыбокі роў вёў драўляны пад'ёмны мост. У Быхаўскім замку пастаянна знаходзіўся значны вайсковы гарнізон, а таксама вялікая колькасць агнястрэльнай зброі і амуніцыі. Аднак з часам, асабліва пасля таго, як Быхаў увайшоў у склад Расіі ў 1772 годзе, замак страціў сваё стратэгічнае значэнне. У 70-х гадах XIX стагоддзя яго выкарыстоўвалі ў якасці турмы, потым — як казармы. У цяперашні час пачалося аднаўленне Быхаўскага замка ў рамках дзяржаўнай праграмы "Замкі Беларусі".



**57-я Чырванасцяжная Смаленская марская ракетаносная авіяцыйная дывізія.** З 1955 па 1991 год яна базіравалася на быхаўскай ваеннай авіябазе. Дывізія складалася з двух Гвардзейскіх Чырванасцяжных палкоў: 179-га Смаленскага і 240-га Севастопальска-Берлінскага. Эксплуатавала самалёты Ту-22М2 і М3, а ў першыя дзесяцігоддзі — Ту-16. Аэрадром меў дзве паласы. Малая, даўжынёй 2 кіламетры, прызначалася для знішчальнікаў, якія прыкрывалі аэрадром. Вялікая, даўжынёй 3 кіламетры, была пабудавана для звышгукавых ракетаносцаў, у тым ліку з ядзернымі боегалоўкамі. Таму, натуральна, быхаўская ваенная авіябаза ў савецкія часы была звышзасакрэчаным аб'ектам, што ў пэўным сэнсе адбівалася і на жыцці ўсяго горада. 5 мая 2005 года ў Магілёўскім абласным ліцэі № 5, які пасяліўся ў сценах былога лазарэта, адкрыўся Ваенна-гістарычны музей 57-й МРАД.




**Быхаўская сінагога** будавалася прыблізна ў той жа час, што і замак. Гэта ўнікальны помнік архітэктуры, паколькі яна ўзводзілася не толькі як культавы, але і як абарончы будынак. Падобныя на нашай зямлі былі толькі дзве — у Вільні і Пінску, але ніводная з іх не захавалася. У Быхаве, дарэчы, ці не ўсе культавыя пабудовы былі пастаўлены так, каб у выпадку прарыву абароны на шляху да замка кожны храм станавіўся для ворага перашкодай. Абарончы характар сінагозе надавалі тоўстыя сцены, размешчаныя высока над зямлёй вокны, магутная вуглавая вежа. Амаль квадратны будынак сінагогі завяршаў пакаты чатырохсхілавы дах. У першыя дні Вялікай Айчыннай вайны сінагога была моцна пашкоджана: у яе трапіла нямецкая бомба. Быў цалкам разбураны дах, месцамі адбіты цокаль. У пасляваенныя гады будынак сінагогі выкарыстоўваўся для патрэб войска, потым ён паступіў у распараджэнне гаргандлю, які размясціў там склад. У цяперашні момант будынак пустуе, але ёсць спадзяванні, што пачнецца яго рэстаўрацыя з фінансавай падтрымкай Ізраіля і ЕўрАзЭС.



**Быхаўшчына літаратурная** прадстаўлена цэлым сузор'ем вядомых літаратараў мінулага і сучаснасці, каго зрадніла з гэтым краем жыццё або творчая дзейнасць. Гэта вядомы літаратуразнаўца, тэкстолаг, крытык, доктар філалагічных навук, член-карэспандэнт НАН Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР Міхась Мушынскі; публіцыст, пісьменнік, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь, прафесар, адзін з заснавальнікаў тэорыі сучаснай айчыннай журналістыкі Барыс Стральцоў; паэт, празаік, перакладчык, сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі Міхась Пазнякоў; літаратар і журналіст, галоўны рэдактар быхаўскай раённай газеты "Маяк Прыдняпроўя" Мікалай Леўчанка; празаік, паэт, драматург Васіль Ткачоў; пісьменнік, перакладчык, аўтар адной з першых прыжыццёвых біяграфій У.І.Леніна (выйшла ў Петраградзе ў 1919 годзе пад псеўданімам "Белорус") Іван Баранкевіч і інш.

**Матэрыялы дадатку падрыхтаваў Мікола ЧЭМЕР.**
*gilevitch@ng-press.by*
**Фота аўтара і з сайта Быхаўскага раённага аддзела адукацыі, спорту і турызму.**

***P.S.*** *Аўтар выказвае падзяку начальніку Быхаўскага раённага аддзела адукацыі, спорту і турызму Ліліі Тарасевіч, супрацоўнікам аддзела Іне Кірэевай і Ірыне Грыгаржэўскай, дырэктару Быхаўскага раённага гісторыка-краязнаўчага музея Сяргею Жыжыяну за вялікую дапамогу ў падрыхтоўцы гэтага культуралагічнага дадатку.*

Мікола Чэмер. Што варта ведаць пра Быхаў і Быхаўшчыну, выпраўляючыся туды ў вандроўку?